■ Парламенцкі дзённік

Спачатку — эканоміка. І сацыяльная абарона

Палата прадстаўнікоў вызначыла парадак разгляду законапраектаў, якія паступілі ў парламент.

За 2 месяцы да пачатку вясновай сесіі Нацыянальнага сходу на разглядзе пастаянных камісій ніжняй палаты знаходзіцца 47 законапраектаў. У графік іх падрыхтоўкі для разгляду на сесіі ўключана 38 пытанняў, у тым ліку 16 законапраектаў у першым чытанні і 20 — у другім. Да пачатку красавіка гэтыя лічбы могуць змяніцца, папярэджваюць заканадаўцы, бо графік не з'яўляецца канчатковым.

— Гэты год для парламентарыяў будзе вельмі напружаным, — папярэдзіў калег на Савеце Палаты прадстаўнікоў яе Старшыня Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. — Пра што сведчыць няпросты характар задач, якія стаяць перад эканомікай краіны. У вырашальную фазу ўваходзіць мадэрнізацыя прадпрыемстваў, амбіцыйныя планы па нарошчванні экспартнага патэнцыялу, чакае вялікая праца па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза.

Вынікі першага года работы дэпутацкага корпуса пятага склікання дазваляюць разлічваць на тое, што і надалей беларускі парламент будзе працаваць эфектыўна, лічыць спікер ніжняй палаты. Са 180 прынятых на працягу 2013 года законапраектаў 113 ужо сталі законамі.

Летась многія з прапаноў дэпутатаў адносна бюджэтнага пакета законапраектаў (усяго такіх прапаноў было больш за 100) былі ўлічаны ўрадам.

— Як бачым, Савет Міністраў гатовы да канструктыўнага супрацоўніцтва, — заўважыў Уладзімір Андрэйчанка, — і з нашага боку павінны быць падрыхтаваны сур'ёзныя, рэальныя, абгрунтаваныя прапановы да праекта бюджэту на 2015 год, работа над якім распачнецца ўжо ў маі. Пры гэтым у рабоце над бюджэтным пакетам павінны ўзяць удзел не толькі профільная камісія, але і ўвесь дэпутацкі корпус.

Уладзімір Андрэйчанка заклікаў парламентарыяў шырэй прыцягваць да працы над законапраектамі вучоных, практыкаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, прадстаўнікоў грамадскасці. Па яго даручэнні падрыхтаваны праект пагаднення аб супрацоўніцтве Палаты прадстаўнікоў з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які плануецца падпісаць у бліжэйшы час.

— Яго рэалізацыя закладзе аснову навуковага забеспячэння нашай дзейнасці, уключаючы навуковую экспертызу праектаў, і, як вынік, павысіць якасць законаў, якія прымаюцца намі, — лічыць Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Яшчэ адна заўвага кіраўніка Палаты прадстаўнікоў датычылася актыўнасці дэпутатаў у рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы. «Нашы прапановы на 2015 год павінны быць абгрунтаваныя, аргументаваныя і, па магчымасці, узгодненыя з профільнымі міністэрствамі, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — У гэтым выпадку іх будзе прасцей адстойваць пры зацвярджэнні плана».

Кажучы пра ролю парламента ў міжнароднай дзейнасці дзяржавы, Уладзімір Андрэйчанка адзначыў добрыя вынікі мінулага года і выказаў незадаволенасць пэўным зацішшам у гэтай сферы апошнім часам.

— Зніжаць тэмп ні ў якім разе нельга, — сказаў ён. — У апошнія месяцы значна пашыралася сетка дыпламатычнай прысутнасці Беларусі ў дзяржавах афрыканскага кантынента. Думаю, гэта вельмі сур'ёзная нагода вывучыць магчымасці развіцця парламенцкіх сувязяў з афрыканскімі дзяржавамі, у тым ліку ўсталявання кантактаў з панафрыканскім парламентам, як гэта мы пачынаем рабіць у дачыненні да Лацінаамерыканскага парламента.

У рабоце дэпутатаў у выбарчых округах на першы план Уладзімір Андрэйчанка паставіў садзейнічанне мясцовым органам улады ў правядзенні шчырых, адкрытых, дэмакратычных выбараў.

— У першую чаргу трэба працаваць з людзьмі, тлумачыць ім важнасць удзелу ў выбарчай кампаніі, дапамагаць ім вырашаць праблемы, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Магчыма, не заўсёды ў дэпутатаў, ды і ў мясцовых органаў улады, ёсць дастатковыя рэсурсы для вырашэння праблем насельніцтва рэгіёнаў — гэта, безумоўна, асобнае пытанне. Але ні ў якім разе нельга дапускаць абыякавага стаўлення да людзей... Акумулюйце, абагульняйце прапановы выбаршчыкаў, абмяркоўвайце іх у камісіях, выносьце на ўзровень міністэрстваў, урада, Адміністрацыі Прэзідэнта. Гэта тое, што чакае ад нас і кіраўніцтва краіны.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Генадзь ГРЫЦКЕВІЧ сярод першачарговых назваў законапраекты, якія датычацца эканамічных адносін, мадэрнізацыі эканомікі: папраўкі ў Законы «Аб прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы», «Аб цэнаўтварэнні», шэраг дакументаў, якія тычацца транспартнай галіны.

У сацыяльнай сферы дэпутаты плануюць у красавіку — чэрвені разгледзець карэкціроўкі ў законы па пытаннях пенсійнага забеспячэння, мінімальнага заробку, вызначэння мінімальнага пражытковага мінімуму.

Сёлета дэпутаты ў тым ліку намераны выступіць з заканадаўчай ініцыятывай аб змяненнях і дапаўненнях у закон «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

КАБ ПАСПЕЦЬ ЗА ЗМЕНАМІ, ТРЭБА МЯНЯЦЦА САМІМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такі падыход, скіраваны на кансалідацыю наяўных рэсурсаў з мэтай развіцця найбольш моцных структур, рэалізуецца і на рэгіянальным узроўні. Так, у 2013 годзе ў Магілёўскай вобласці створана камунальнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці», якое выпускае абласныя выданні і стужку абласных навін. У Віцебскай вобласці на базе абласных газет «Віцебскі рабочы» і «Народнае слова» сфарміравана рэдакцыя газеты «Витебские вести».

Адным з напрамкаў павышэння якасці раённай прэсы быў абраны пераход шэрагу газет, у першую чаргу — «адстаючых», на штотыднёвы фармат. Практыка паказала, што такі падыход дае станоўчыя вынікі. Перш за ўсё, фармат штотыднёвіка дазваляе палепшыць змест выдання за кошт павелічэння інфармацыйнай насычанасці, публікацыі буйных жанраў: аналітыкі, журналісцкіх расследаванняў, праблемных матэрыялаў. Сёння ў такім фармаце выходзіць 23 раённыя газеты, прычым 15 сталі штотыднёвікамі сёлета.

Арганізацыйныя пераўтварэнні працягнуцца і ў 2014 годзе, але галоўнай задачай сёння з'яўляецца якаснае змяненне самога інфармацыйнага прадукту. Прычым найважнейшым складнікам у гэтым плане з'яўляецца тэхналагічнае аснашчэнне СМІ. Нашы новыя інфармацыйныя структуры павінны знайсці адэкватны адказ на выклік канвергенцыі і забяспечыць максімальнае распаўсюджванне свайго кантэнту за кошт інтэграцыі розных медыяплатформаў (друкаваных, інтэрнэт-, мабільных версій, аўдыявізуальных рэсурсаў і г.д.).

З гэтай мэтай плануецца значна ўзмацніць інтэрнэт-складнік у дзейнасці ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия», дзе будуць аб'яднаны вэб-рэсурсы ўсіх СМІ ўстановы, прадугледжана шырокая інтэграцыя з сацыяльнымі сеткамі, арганізацыя электроннай падпіскі на друкаваныя і інтэрнэт-версіі выданняў і асобныя публікацыі. Установе таксама будзе перададзены інтэрнэт-партал «СМІ Беларусі», які стане не толькі адзіным пунктам уваходу для ўсіх дзяржаўных СМІ, але і будзе аказваць метадычную дапамогу рэгіянальнай прэсе ў развіцці яе вэб-рэсурсаў.

У новым годзе мы прыступім і да рэформы сістэмы арганізацый «Саюздрук». Як і ў выпадку з рэформай друкаваных СМІ, тут работа будзе весціся акуратна і ўзважана, каб захаваць усе тыя добрыя напрацоўкі, якія сёння ёсць у гэтай сістэмы. Разам з тым неабходна павышаць эфектыўнасць лагістыкі, актыўна пашыраць гандлёвую сетку, будаваць новыя сучасныя гандлёвыя павільёны. Словам, патрэбна канцэнтрацыя рэсурсаў у мэтах узмацнення канкурэнтных пераваг на рынку распаўсюджвання друку.

Наспела і аптымізацыя сістэмы дзяржаўных выдавецтваў. Бачыцца мэтазгодным аб'яднаць выдавецтвы, якія выпускаюць літаратуру падобных тэматычных напрамкаў.

УСЮ КРАІНУ ПЕРАВЕСЦІ НА ЛІЧБУ

Найважнейшым напрамкам развіцця электронных СМІ з'яўляецца іх поўны пераход на лічбавае вяшчанне да 2015 года.

У 2013 годзе сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі было арганізавана паэтапнае адключэнне вяшчання ў аналагавым фармаце. З 1 кастрычніка 2013-га пачалася трансляцыя другога і трэцяга мультыплексаў эфірнага лічбавага тэлебачання ў асобных рэгіёнах краіны. Там, акрамя васьмі тэлепраграм абавязковага агульнадаступнага пакета («Беларусь-1», «Беларусь-2», «Беларусь-3», АНТ, СТБ, «РТР-Беларусь», «НТБ-Беларусь», «Мір»), за ўмераную плату цяпер дадаткова даступна 24 тэлепраграмы рознай жанравай накіраванасці. Гэтая праца будзе прадоўжана ў 2014 і 2015 гадах.

Цяпер Мінінфармам сумесна з Мінсувязі вядзецца работа па пераводзе на лічбавае вяшчанне рэгіянальных тэлепраграм. Мясцовае тэлебачанне патрэбна людзям і павінна развівацца як творча, так і тэхналагічна.

Працягвае развівацца нацыянальнае тэлевяшчанне і ў плане зместу. Важнай падзеяй у сферы спартыўнай журналістыкі стала адкрыццё тэлеканала «Беларусь-5». Гэты канал закліканы асвятляць нацыянальныя спартыўныя мерапрыемствы, найбуйнейшыя сусветныя спаборніцтвы, найбольш цікавыя і відовішчныя спартыўныя падзеі за мяжой.

ІНТЭРНЭТ — НА СЛУЖБУ ГРАМАДСТВУ І ДЗЯРЖАВЕ

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Міністэрства інфармацыі працуе над стварэннем Адзінага дзяржаўнага інтэрнэт-партала для зваротаў грамадзян («Віртуальная прыёмная»).

Гэты праект дазволіць нашым грамадзянам не займацца пошукам сайта таго ці іншага дзяржаўнага органа або арганізацыі. Усе неабходныя звесткі можна будзе знайсці ў адным «пункце ўваходу». Дзяржаўныя органы будуць аб'яднаны ў агульную віртуальную сістэму, тым самым значна спросціцца працэдура звароту да іх.

«Віртуальная прыёмная» дазволіць аналізаваць увесь паток зваротаў, а таксама выяўляць найбольш праблемныя пытанні, якія турбуюць грамадзян. Гэта абсалютна новы ўзровень маніторынгу і аператыўнага рэагавання, канкрэтны крок у кірунку да электроннага ўрада.

Сур'ёзныя крокі зроблены ў сферы нарматворчасці. Летась уступіў у сілу Закон «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Уведзена ліцэнзаванне ў галіне вяшчання. Фактычна мы ўніфікавалі заканадаўства з нашымі партнёрамі па Мытным саюзе — Расіяй і Казахстанам.

У 2014 годзе Мінінфарм прымае ўдзел у падрыхтоўцы праекта дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Кожная з краін — удзельніц Адзінай эканамічнай прасторы ўнесла ў дадатак да праекта дагавора свае прапановы па захаванні асобных абмежаванняў доступу на нацыянальныя рынкі інфармацыйных паслуг.

Перакананы, што спалучэнне правільных арганізацыйных захадаў, дынамічнага тэхналагічнага развіцця і цвёрдай пазіцыі, скіраванай на абарону нацыянальных інтарэсаў, дазволіць нам забяспечыць канкурэнтаздольнасць нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ў сучасным зменлівым свеце.

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ,
міністр інфармацыі
Рэспублікі Беларусь.

■ Чысціня рэпутацыі

ФІКТЫЎНЫЯ, АЛЕ НЕ ЭФЕКТЫЎНЫЯ

Дэпартамент фінансавых расследаванняў прапаноўвае новыя меры барацьбы з ілжэпрадпрымальнікамі.

Кіраўніцтва адной з буйных у рэспубліцы кампаній, якая завозіла оптам аўтамабільныя запчасткі, вырашыла абвесці дзяржаву вакол пальца. Каб не плаціць падаткі, заключыла здзелку з так званай фірмай-аднадзёнкай. У выніку, калі б не органы фінансавых расследаванняў, дзяржаўны бюджэт мог недалічыцца больш як 3 млрд рублёў...

Кіраўнікоў прадпрыемства арыштавалі. У іх, паводле слоў **дырэктара Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Ігара МАРШАЛАВА,** канфіскавалі Br2,4 млрд, больш як 1,2 млн расійскіх рублёў, звыш $400 тысяч і 67 дарагіх аўтамабіляў.

І гэта толькі адзін прыклад таго, чым можа скончыцца гульня не па правілах і спадзяванне на «авось». Усяго за мінулы год фінансавая міліцыя выявіла 483 ілжэструктуры. На іх рахунках «заблакіравана» больш за 55 млрд рублёў.

— Імкнёмся дайсці да кожнага прадпрыемства, кіраўнікі якіх спрабуюць скарыстацца паслугамі фірмаў-аднадзёнак, каб аблегчыць сабе падатковы цяжар, — адзначыў Ігар Маршалаў. — Бо менавіта яны сваім попытам выклікаюць прапанову і спрыяюць усплёску злачыннасці.

Ілжэпрадпрымальнікі, у сваю чаргу, не спяць у шапку. Карыстаюцца тым, што дзяржава ідзе насустрач людзям, якія плануюць заняцца легальным бізнесам, і спрашчае працэдуру рэгістрацыі. Яны рэгіструюць арганізацыі на падстаўных асоб (часцей за ўсё на іншаземных), адкрываюць рахунак у банку і аказваюць мядзведжыя паслугі іншым прадпрыемствам, нелегальна пераводзяць іх грашовыя сродкі ў наяўныя.

Вопыт той жа Швейцарыі паказвае, што з такімі фірмамі-аднадзёнкамі змагацца можна. Там зарэгістраваць кампанію — справа далёка не танная і хуткая, прыцягваюцца натарыусы і адвакаты. Таму фірмаў-аднадзёнак у Швейцарыі амаль няма.

Спробы кантраляваць гэтую сферу прадпрымаюцца і ў нашай краіне. Так, паводле слоў Ігара Маршалава, у парламенце разглядаецца законапраект, які ўводзіць адказнасць за стварэнне фіктыўных кампаній. Вялікія надзеі Дэпартамент фінансавых расследаванняў ускладае і на электроннае адміністраванне падатку на дабаўленую вартасць, якое плануецца ўвесці ў 2016 годзе.

А пакуль што Ігар Маршалаў раіць кіраўнікам прадпрыемстваў быць абачлівымі і, перш чым заключаць здзелку, зазірнуць у рэестр сумнеўных камерцыйных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, каб пераканацца ў чысціні рэпутацыі контрагента. Сёння ў гэтым рэестры «засвяцілася» больш як 2,5 тысячы суб'ектаў.

Надзея ДРЫЛА

■

«НЕ ХАЦЕЛА НІКОМУ БЫЦЬ У ЦЯЖАР І ЎВОДЗІЦЬ У ГРЭХ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, спачатку Алена Аўрамаўна хацела пажыць у «Світанку» месяц, паглядзець, ці спадабаецца (такі варыянт цалкам дапусцімы), але потым перадумала: сіл лішніх на пе-

раезды няма, трэба ўсё вырашаць адразу. «Тым больш, тут вясковае паветра, цішыня... Што яшчэ трэба пажылому чалавеку? — усміхаецца яна, і праменьчыкі маршчынак каля вачэй становяцца выразней. — Калі б раней мне прапанавалі з'ехаць з горада, я, вядома б, адмовілася, але ў сталым веку прыярытэты мяняюцца. Выгоды тут ёсць, ежу гатуюць, бялізну можна здаць у мыццё. Прычым раніцай здасі, а ў тры гадзіны ўжо можна забіраць чыстае. Чым дрэнна? У нас ёсць і агульная кухня. Калі хочаш, можна сабе і самому што-небудзь прыгатаваць. Я летась пякла бліны на Масленіцу, і ў гэтым годзе таксама буду. Прыязджайце, пачастую, яны ў мяне смачныя атрымліваюцца...».

На развітанне яна суе мне ў рукі апельсін: «Вазьміце, з'ясце дома!» Потым ціха кажа пра сваю мару: «Хачу памерці прыгожа. Галоўнае — каб нікому не надакучаць. Я ні пра што не шкадую. Я памру, рана ці позна. А кватэру з сабой усё роўна не забярэш...».

❑ ❑ ❑

Падобная гісторыя і ў Марыі Іванаўны Беляковай, якая таксама пасля смерці мужа задумалася, як ёй жыць далей, і выбрала такі ж варыянт, што і Алена Аўрамаўна.

— Чалавек я ўжо ва ўзросце, хворы. Адной у чатырох сценах стала адчуваць сябе неяк няўтульна, нават страшна. Вось і вызначылася, — кажа яна. — Перад тым, праўда, доўга думала, месяцаў восем. Але я сама былы



медработнік, ведаю, якія бываюць страшныя хваробы ў маім узросце: і інфаркты, і інсульты. А калі я акажуся прыкаванай да ложка, хто мяне будзе даглядаць? Вось і вырашыла: што я губляю? Вядома, кватэра ёсць кватэра, але тут я буду не адна. І ведаеце, я задаволена. Вось заўтра іду да зубнога доктара, так мне ўжо некалькі разоў нагадалі, каб я не забылася. І кормяць добра. Ды і сяброўкі новыя ўжо з'явіліся, свая кампанія...»

❑ ❑ ❑

Вось такія гісторыі. Маладосць, магчыма, легкадумна падумае: я на іх месцы прадаў бы кватэру і паехаў бы на ўзбярэжжа цёплага мора, каб там прыгожа скончыць свае дні... Але ёй цяжка зразумець і прыняць, што пасля 70 магчымасці чалавека, хочам мы таго ці не, рэзка звужаюцца. Пажылому чалавеку ўжо не трэба чужое мора і чужыя людзі, якія размаўляюць на не зразумелай яму мове, — яму патрэбны родныя і іх клопат і любоў. Ну, а калі родных людзей не засталося, то проста камфорт і догляд, зносіны з іншымі людзьмі, павага і адносная незалежнасць.

Здаць кватэру кватарантам і жыць на гэтыя грошы ў тым жа доме-інтэрнаце, у аддзяленні павышанай камфортнасці? Але з кватарантамі могуць быць праблемы: людзі ж розныя бываюць. Ды і пасля іх трэба рабіць рамонт. А кватэра, калі няма спадчыннікаў, усё роўна потым дастанецца дзяржаве. Прадаць кватэру? Варыянт для смелых людзей, якія добра разбіраюцца ў кан'юнктуры рынку, да якіх пажылыя людзі, як правіла, не адносяцца. Падарыць кватэру камусьці з далёкіх сваякоў або знаёмых у абмен на догляд? Нашы гераіні патлумачылі, чаму яны не сталі гэтага рабіць. Увогуле, выбар за самім чалавекам.

Святлана БУСЬКО.

КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

Намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА:

Афармленне такіх рэнтавых адносін магчыма ў двух варыянтах: чалавек застаецца пражываць у сваёй кватэры ці пераязджае ў Рэспубліканскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы павышанай камфортнасці «Світанак», у асобны блок.

Наш самы першы атрымальнік рэнты, мужчына з Кастрычніцкага раёна, з якім мы заключылі дагавор пажыццёвага ўтрымання на ўмовах рэнты ў 2011 годзе, абраў першы варыянт. У гэтым выпадку чалавек застаецца жыць у сваёй кватэры, і да яго пяць разоў на тыдзень прыходзіць сацработнік. Прычым усе яго паслугі бясплатныя.

Хачу адзначыць, што першы варыянт выбіраюць, як правіла, людзі, якія яшчэ нядрэнна сябе адчуваюць і поўныя сіл, тыя, хто хоча застацца ў сваёй звыклай абстаноўцы, у каго добрыя суседзі. Сацработнік дапаможа такому чалавеку пры жаданні схадзіць у тэатр ці ў якую-небудзь іншую культурную ўстанову — пры жаданні можна скласці цэлую культурную праграму. Таксама сацработнік можа суправадзіць свайго падапечнага ў паліклініку, да месца пахавання сваякоў на могілкі і г.д. Адным словам, чалавек застаецца жыць у сваёй кватэры да смерці і карыстаецца такімі выгодамі.

У той жа час адзінокія людзі за 70, якіх няма каму даглядаць, могуць выбраць «Світанак», дзе для іх арганізавана пастаяннае медыцынскае суправаджэнне, назіранне дактароў вузкіх спецыяльнасцяў, праводзяцца розныя рэабілітацыйныя мерапрыемствы, фізіятэрапія, ёсць заняткі ў спартыўнай зале і г. д. Да таго ж у «Світанку» працуюць розныя гурткі, працоўныя майстэрні, клубы па інтарэсах, літаратурныя гасцёўні — можна цікава праводзіць свой вольны час. А харчаванне можна заказваць на выбар.

Павінна сказаць, што тыя пажылыя людзі, якія зараз карыстаюцца паслугамі рэнтных адносін, вельмі прадумана падышлі да гэтага пытання. Бо гарантыяй служыць іх уласнае жыллё. Таму яны доўга і старанна ўсё ўзважвалі, скрупулёзна праглядалі ўсе пункты дагавора, пралічвалі ўсе «за» і «супраць».

Тым больш, што было шмат негатыўных момантаў, калі грамадзяне заключалі такія дагаворы з фізічнай асобай, гэта значыць, з іншым чалавекам. Дапусцім, з суседам або цётка з пляменнікам, або сябар сям'і з бабуляй... Дык вось, гэтую бабулю абходжвалі толькі да таго моманту, пакуль не заваладвалі яе кватэрай. Як толькі гэта здаралася, пра яе тут жа забывалі. Таму людзі, наслухаўшыся падобных гісторый, ставіліся вельмі асцярожна да падобнай прапановы.

Але дагавор рэнты, заключаны з дзяржавай, — гэта трохі іншае. Тут чалавека абслугоўвае сацработнік, абсалютна не зацікаўлены ў яго жыллі, і гэта выклікае ў людзей больш даверу. Да таго ж дагаворам прадугледжана, што калі пажылы чалавек не знойдзе агульнай мовы з сацыяльным работнікам, то па яго жаданні мы знаходзім для яго іншага чалавека. Праўда, пакуль у нас такіх выпадкаў не было.

Я думаю, гэты накірунак будзе развівацца. Першы вопыт аказаўся станоўчым, людзі адгукаюцца добра. Зараз у нас 16 чалавек, якія заключылі з дзяржавай дагавор рэнты. Сярод іх — тры сямейныя пары. Дарэчы, адна сямейная пара засталася жыць дома, а дзве — пераехалі ў «Світанак».

АФІЦЫЙНА

Згодна з пастановай Савета Міністраў № 738 ад 08.06.2011, грамадзяне, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту, могуць заключыць дагавор пажыццёвага ўтрымання на ўмовах рэнты, пасля чаго атрымліваюць права бясплатнага пражывання ў доме-інтэрнаце санаторнага тыпу «Світанак» або сацыяльнага абслугоўвання на даму і атрымання ад дзяржавы грашовых сум выплат рэнты за кватэру.

Рэнта — гэта дагавор пажыццёвага ўтрымання, згодна з якім, грамадзянін, атрымальнік рэнты, перадае жылое памяшканне, якое яму належыць, ва ўласнасць г. Мінска, а плацельшчык рэнты абавязуецца ажыццяўляць пажыццёвае ўтрыманне грамадзяніна і (або) яго жонкі (мужа). Плацельшчыкам рэнты з'яўляецца горад Мінск у асобе Мінгарвыканкама.

Гарантыі для атрымальнікаў рэнты з боку дзяржавы:

1. Аплата натарыяльных паслуг пры заключэнні дагавора, яго дзяржаўнай рэгістрацыі, афармлення здзелак, звязаных з перадачай жылога памяшкання;

2. Штомесячныя плацяжы ў памеры 1-3 базавых велічынь;

3. Адлічэнні на капітальны рамонт за жылое памяшканне;

4. Тэхнічнае абслугоўванне жылога памяшкання;

5. Адлічэнні на аплату камунальных паслуг;

6. Аказанне сацыяльных паслуг сацыяльнымі работнікамі;

7. Аказанне паслуг па пахаванні і іншыя ўмовы.

Каб заключыць дагавор пажыццёвага ўтрымання на ўмовах рэнты, неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання па месцы знаходжання кватэры.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НЕ ЧУЖАЗЕМНЫЯ — НАШЫ...

Больш за 4,7 мільярда рублёў накіравалі на дапамогу хлопчыкам і дзяўчынкам, якія аказаліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, удзельнікі сёлетняй навагодняй рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці».

Фота БЕЛТА

Пра гэта паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі міністр адукацыі Сяргей Маскевіч.

— З кожным годам інтарэс да акцыі «Нашы дзеці» ўзрастае. Сёлета ў рамках акцыі было праведзена 6,5 тысячы мерапрыемстваў. Трэба сказаць, што ў дапамозе дзецям вельмі актыўна сябе праявілі прадстаўнікі бізнесу, спартсмены і спартыўныя арганізацыі, — адзначыў міністр. — Таксама вельмі радуе наступны факт: шэфства многіх удзельнікаў не абмежавалася адным-двума візітамі падчас самой акцыі. Гэта сведчыць аб сацыяльнай падтрымцы і клопаце аб дзецях.

Намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена Галаўнёва распавяла, што ў гэтым годзе акцыяй «Нашы дзеці» былі ахоплены больш за 900 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак. Падарункі ім падрыхтавалі самыя розныя: ад святочных прадстаўленняў і экскурсій да звычайных, патрэбных у паўсядзённым жыцці рэчаў. Так, адна з беларускіх кампаній, акрамя прэзентаў кожнаму з выхаванцаў, падаравала дзіцячаму дому пасудамыечную машыну, а іншая — забяспечыла садавіной напярэдадні навагодніх свят выхаванцаў больш чым 50 дзіцячых устаноў. Цікава, што сваю дапамогу прапаноўваюць не толькі арганізацыі і прадпрыемствы, але і фізічныя асобы. Многія з іх прасілі не згадваць імёнаў і прозвішчаў, дапамагалі ананімна.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ПРЫЗ ЗА ДОБРАСУМЛЕННАСЦЬ

У Магілёве плацельшчыкам, якія не маюць даўгоў за камунальныя паслугі, уручаць падарункі.

Атрымаць іх змогуць тыя, хто прыме ўдзел у розыгрышы рэкламнай гульні «Самы дысцыплінаваны плацельшчык», якую ўжо не першы год праводзіць у Магілёве Цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм. Вынікі гульні, у прызавым фондзе якой 160 падарункаў, будуць падводзіцца ў апошні дзень студзеня. А напярэдадні адбудзецца акцыя, якую гэтая ж установа ужо трэці год ладзіць сумесна з упраўленнем ДАІ аблвыканкама.

Інспектар ДАІ будзе спыняць аўтамабілі для праверкі ў кіроўцаў дакументаў, а прадстаўнік ЦГІСа паглядзіць па базе звестак, ці ёсць у іх «камунальныя» даўгі. Тых, хто іх не мае, а таксама з'яўляецца дысцыплінаваным удзельнікам дарожнага руху, чакае двайны падарунак — ад камунальнікаў і дзяржінспекцыі. У іншым выпадку — заўвага і павучальная гутарка.

Як паведаміў намеснік дырэктара ЦГІСа Павел Жуйкоў, гэтыя мерапрыемствы вельмі дысцыплінуюць жыхароў горада. Колькасць нядобрасумленных плацельшчыкаў памяншаецца. Напрыклад, яшчэ 5 гадоў таму іх было ў Магілёве каля 7-8 тысяч чалавек, а цяпер каля 5 тысяч. І гэта пры тым, што жылфонд за апошнія гады значна павялічыўся.

Нэлі ЗІГУЛЯ

КОЛЬКАСЦЬ РАБОТНІКАЎ ПАМЕНШЫЛАСЯ

Колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва ў нашай краіне летась зменшылася на 1,3% у параўнанні з 2012 годам і склала 4 517 800 чалавек. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Колькасць звольненых работнікаў у снежні 2013 года перавысіла колькасць прынятых на 11,5 тыс. чалавек (у снежні 2012 года — на 9 тыс. чалавек). Каэфіцыент замяшчэння работнікаў (адносіны колькасці прынятых да колькасці звольненых) склаў 0,832 (у снежні 2012 года — 0,857).

Так, усяго па рэспубліцы ў снежні 2013 года было прынята на працу 57,2 тыс. чалавек, у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 3,6 тыс. чалавек. Звольнена па розных прычынах 68,7 тыс. чалавек. З іх 7,3% былі звольнены за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 2,8% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, ліквідацыяй арганізацый.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец снежня 2013 года, як і на канец снежня 2012 года, склаў 0,5% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Святлана БУСЬКО.

У ЖЫХАРОЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ 17 ТЫСЯЧ «СТВАЛОЎ»

У жыхароў Віцебскай вобласці на руках больш як 16,9 тысячы адзінак так званай грамадзянскай зброі.

Паводле інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама, большасць гэтай зброі, якую афіцыйна дазволена захоўваць, — прыкладна 15,1 тысячы «стволаў» — гладкаствольнай паляўнічай, каля 860 адзінак — газавай зброі, каля 1000 — з наразным стволам. На ўліку ў міліцыі сёння каля 13,9 тысячы ўладальнікаў зброі.

Летась у Прыдзвінскім краі з незаконнага абароту выведзена каля 400 адзінак незарэгістраванай зброі, больш як 12,8 тысячы боепрыпасаў.

— Пераважная большасць незарэгістраванай канфіскаванай і добраахвотна здадзенай наразной зброі знойдзена ў месцах баёў часоў Вялікай Айчыннай вайны, у старых домаўладаннях альбо набыта і перавезена з сумежных дзяржаў. За парушэнні правілаў абароту зброі складзены 371 пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Заведзена 130 крымінальных спраў, — паведамілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СТРАЛЯЛІ, «ПЯТЛЯЛІ», АЛЕ АД АДКАЗНАСЦІ НЕ ЎЦЯКЛІ

У Сенненскім раёне брыгада палявала на пушнога звера. Аднак замест зайцаў пад прыцэл нядобрасумленных паляўнічых папаліся дзве казулі...

Падзяліўшы здабычу і разбіўшыся на пары, парушальнікі панеслі трафеі: адзін — да машыны, другі — праз лес да дарогі, каб падсесці ў аўтамабіль пазней.

Стрэлы ў лесе насцярожылі дзяржінспектараў, якія знаходзіліся побач. Яны таксама разбіліся на дзве групы, уявіўшы, як сябе могуць паводзіць браканьеры, і не памыліліся — выйшлі дакладна насустрач. І «ўзялі» іх з доказамі віны, паведамілі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Па факце незаконнага палявання, якое нанесла шкоду прыродзе ў асабліва буйным памеры (15,6 мільёна рублёў) будзе заведзена крымінальная справа.

У той жа дзень у Аршанскім раёне дзяржінспектары затрымалі жыхара вёскі Рускі Сялец. У заплечніку ён нёс мяса дзвюх казуль. Іх браканьер здабыў пры дапамозе металічных сілаў, а рэшткі ўтапіў у рацэ, зрабіўшы ў лёдзе палонкі. Цяпер парушальніку трэба будзе пакрыць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду — зноў жа 15,6 мільёна рублёў — і адказаць перад судом.

Сяргей РАСОЛЬКА.